## Красавік

**1/19. Дар'я Вясенняя**. Свята вясны ў некаторых паўночна-ўсходніх раёнах (Дабравольскі, 1914). На апошні сняжок і ранішні мароз сяляне выносілі адбельваць палотны.

У царкоўным календары – дзень пакутнікаў Хрысанфа і Дар'і (283 г.) і з імі пакутнікаў Клаўдзія-трыбуна, Іларыі, яго жонкі, Іясона і Маўра, іх сыноў, Дыядора-прасвіцера і Марыяна-д'якана. У гэты дзень ушаноўваюцца царквою і іншыя прападобныя і пакутнікі, у тым ліку праведніца Соф'я, княгіня Слуцкая (1612 г.), а таксама абраз Маці Боскай Смаленскай, што называецца «Замілаванне» (1103 г.).

Як у беларусаў (гл.: 14 крас.), так і ў многіх народаў 1 красавіка звязана з днём смеху і дружалюбнага падману. У Англіі ён называецца «днём усіх дурняў» (All fool's day). У Германіі адзін аднаго пасылаюць выконваць смешныя даручэнні, напрыклад, купіць у аптэцы камарыны тлушч і г.д. Лічаць, што ў гэты нешчаслівы дзень нарадзіўся Іуда. Падобны дзень быў здаўна вядомы не толькі Еўропе, але і ў азіяцкіх краінах – Індыі, Кітаі, Японіі (КЗ, 1977. С. 96, 155).

* Пачатак **Пахвальнага тыдня** – тыдня перад Вербніцай. Назва паходзіць ад дзеяслова «хваліцца». «Дзікая качка яйцэм похваліцца»; «На Похвальный тыжэнь хаты не начынаюць рабіці. Кажуць, урэдный ён» (Лельчыцкі р-н); «Похвальная похваліць, то Вэрбная поправіць» (Пінскі р-н); «Нельзя беліць хату, снаваць кросна: похвалісса зрабіць – не похвалісса знасіць» (Мазырскі р-н; Талстая, 1986).

Рускія тлумачылі назву тыдня тым, што ў цэрквах чытаўся ў гэты дзень акафіст «Похвала Богородице» (Ярмолаў, 1901. С. 108).

***Пахвальная пятніца** – дзень на Пахвальным тыдні. На Піншчыне мылі ўсе дзежкі.

**4/22. Васіль Сонечнік.** Свяшчэнапакутнік Васіль, прасвіцер Анкірскі, які быў замучаны за веру ў Хрыста арыянамі 23 чэрвеня 362 г., атрымаў прозвішча Васіля Сонечніка. «Васіль Сонечнік ледзяшы са стрэх здымае» (Ляснічы, 1990). У рускіх: «Василий Солнечник. Василий Парник. Василий Капельник – с крыш каплет» (Кастрамская губ.; Ярмолаў, 1901). Памяць аб ім была перанесена на гэты дзень, каб не адзначаць разам са святам Пятра і Паўла.

***Мезіна субота** – дзень перад Вербніцай (Тураўскі сл., 1984).

***Пахвальная субота** – дзень на Пахвальным тыдні. Не працавалі, святкавалі (Талстая, 1986). У Лельчыцкім раёне ў «Пахвальную суботу і ўвесь тыдзень баяліся грымаць кроснамі, каб не грымеў гром».

**5/23.** ***Арына (Ірына).*** Беларусы-католікі прыкмецілі: «На Арыну (Ірыну) сей капусту ў расадніках (на расаду)» (БГК, 1926; Паўлюкоўскі, 1934).

**6/24. Камаедзіца.** Язычніцкае свята пакланення мядзведзю, зафіксаванае ў мінулым стагоддзі у Бягомльскім прыходзе Барысаўскага павета. Вось яго апісанне, зробленае адным з карэспандэнтаў П.Шэйна.

«У гэты дзень гатуюць асобную ежу, менавіта: на першую страву – сушаны рэпнік у гонар таго, што мядзведзь харчуецца пераважна раслінным кормам, травамі; на другое падаецца кісель, бо звер любіць авёс; трэцяя страва складаецца з гарохавых камоў, ад якіх і само свята атрымала назву Камаедзіцы.

Пасля абеду ўсе – і старыя, і малыя – кладуцца адпачываць, але не спяць, а час ад часу пераварочваюцца з боку на бок, нібыта мядзведзь у бярлозе. Цырымонія працягваецца каля дзвюх гадзін – усё робіцца дзеля таго, каб мядзведзь лёгка падняўся пасля зімовага сну. Потым сяляне ўжо не займаюцца сваімі дзённымі справамі, святкуюць. Паводле павер'я, мядзведзь у гэты дзень абуджаецца ад спячкі. Выходзіць са сваёй бярлогі. Вось і сустракаюць яго добразычліва.

Пачатак свята бярэ, без сумнення, ад часоў дахрысціянскіх і служыць верагоднай дакументацыяй таго, што ў дадзенай мясцовасці пакланяліся мядзведзю. Па ўспамінах старажылаў, у гэтым рэгіёне некалі былі магутныя лясы і непраходныя нетры, дзе вялося мноства дзікіх звяроў. Мядзведзь, які вылучаўся сваёй сілаю, ростам, наводзіў страх на людзей. Каб задобрыць яго, людзі і прыдумалі звычай ушаноўваць мядзведзя» (Шэйн, 1902).

Гэтыя татэмістычныя вераванні нашых далёкіх продкаў не малі падвергнуцца хрысціянізацыі і знікнулі ў сілу свайго яўнага «паганства».

У Эстоніі мядзведзь меў два дні ў годзе: у сярэдзіне зімы (14 студзеня), калі «пераварочваўся на другі бок», і ў «сярэдзіне лета». Таму можна меркаваць, што беларускі цар лясоў «паварочваўся» менавіта блізка да даты вясенняга раўнадзенства. Ля новага года ён мог апынуцца пазней, у хрысціянскі перыяд, пасля прыняцца хрысціянскай рэформы. Вобраз мядзведзя прысутнічае ў фальклоры многіх народаў: на Грамніцах, Масленіцы, веснавым карнавале, Калядах. Б.Рыбакоў у беларускіх Камаедзіцах знаходзіць аналогіі з грэчасцкімі «камедыямі». «Мядзведзь» быў зверам Артэміды, адпаведна рускай багіні Лады» (1988. С. 668).

У даследчыкаў (Уласаў, 1993. С. 110; Рыбакоў, 1981. С. 100) не ўзнікае сумнення адносна культа мядзведзя як сакральнай жывёлы ў сістэме татэмізму, які датуецца палсамітам і мае аналогію

з традыцыямі Аўстраліі. Беларуская Камаедзіца справядліва лічыцца сярод даследчыкаў найбольш архаічнай. Акадэмік Б.А.Рыбакоў тлумачыць, што іх дзень мог быць сярэдзінай славянскай масленіцы (с. 314, 376). У міфалагічных уяўленнях народаў свету і рытуале мядзведзь можа выступаць як боства (у прыватнасці, якое памірае і адраджаецца), культурны герой, пачынальнік традыцый, продак, родапачынальнік, татэм, дух-ахоўнік, гаспадар ніжняга свету, свяшчэная і (або) ахвярная жывёла, зааморфны класіфіката, элемент астральнага коду, увасабленне душы, дарыцель, звярыны двайнік чалавека, памочнік шамана, яго зааморфная іпастась і душа, пярэварацень і г.д. (Міфы, 1992. С. 128).

У беларускім фальклоры, як і ў вуснай творчасці многіх народаў, мядзведзь, лічыўся царом усіх звяроў, асноўным персанажам казак пра жывёл. Міфалагічны вобраз яго добра апісаны А.Ненадаўцам (1993. С. 243-258).

**Благавесны тыдзень** – тыдзень, на які прыпадае Благавешчанне.У некаторых рэгіенах звязаны з забаронамі, што і асноўнае свята Благавешчання. «На Благавесным тыдні не навіваюць красён, не снуюць – мусіць, дзяля гадзюк» (Талстая, 1984. С. 186).

**Благавеснік.** Дзень перад Благавешчаннем. На Століншчыне кажуць: «Не так бойся Благовешчэння, як бацька яго. Благовеснік – это бацько Благовешчэння». Дзень падрыхтоўкі да свята. «Бабы пякуць пірагі»– накшталт «бусковых» лап (Булгакоўскі, 1890).

**7/25. Благавешчанне (Дабравешчанне, Звеставанне).** Забаранялася снаваць кросны: «іначай можна «заснаваць дождж» на ўсё лета; будзе хварэць той, хто носіцьтканіну з такой асновы» (Нікіфароўскі, 1897. С. 241). Лічылася вялікім святам, святам прылёту бусла, ластаўкі. У Драгічынскім раёне, напрыклад, калі ўпершыню бачылі белую птушку, то клікалі: «Бусько, бусько, на тобі галёпу, а ты мыні дай жыта сторону, на тобі сырпа, дай мыні жыта снопа» (Талстая, 1986). Галёпы – гэта пшанічныя пірагі ў выглядзе бусла, што пяклі і на Гродненшчыне. Шчасціла нібыта таму, хто ўбачыць першага бусла, які ляціць, а не стаіць. А ў таго, каму трапіць на вока стаячы, нібы будуць балець ногі. На Палессі дзеці сустракалі птушку радаснай песняй:

Бусел, бусел-клекатун,
Узяў бабу за каўтун...

У гэты дзень забаранялася гарадзіць плот, убіваць у зямлю колле, не пачыналі сеў, не выганялі першы раз кароў, не вывозілі гной у поле. Са святам звязана шмат прыкмет. «Дабравешчанне без ластавак – халодная вясна» (БСК, 1939), «Калі пчала не выходзіць з

вулля да Дабравешчання, то будзе цёплае, ураджайнае лета, а калі пакажацца раней – то благое, беднае» (Берман, 1873).

Гаспадыня падымалася раней мужа, каб выканаць абрад «развязвання сахі» (Навагрудскі п.; Крачкоўскі, 1874). У Свіслацкім раёне жанчыны не расчэсвалі валасы, каб «куры расаду не дралі». Пасля абеду ва многіх раёнах Беларусі «гукалі вясну». Спявалі:

У нас сягоння Благавешчанне.
У нас дзевачкі – дарагі тавар,
У нас хлопчыкі – дзяшовы тавар...
*(Гомельскі п.;; Радчанка, 1888).*

Песні напаміналі пра далёкія часы куплі-продажу нявест і іншыя рэлікты. Моладзь наладжвала гульні, карагоды. У валачобных песнях апавядаецца:

Благавешчанне – араты на ніву,
Араты на ніву, сядун на прызбу.
Гаспадару, слаўны мужу,
Слаўны мужу над мужамі,
Вазьмі, ваша, нову сошку
Да й коніка варанога,
Варанога, маладога.
Едзь жа, ваша, у чыста поле,
У чыста поле заараць
З соллю, з хлебам...

Пра свята ходзіць шмат прымавак: «Да Благавешчання зіму не лай  і сані трымай» (Лельчыцкі р-н; Цітовіч, 1974); «З благавешчанскага цяляці каровы не ждаці» (Барысаўскі п.; Ляцкі, 1898); «На Благавешчанне дзеўка косу не пляце, птушка гнязда не ўе» (Слуцкі п.; Сержпутоўскі, 1930). Асабліва было шмат забарон: «На Дабравешчанне няможна нічога з лесу прыносіць, бо ў доме завядуцца гадзіны, чарвякі і інш.» (Шукевіч, 1910), «У гэты дзень не садзяць на яйкі гусей – інакш будуць калекі» (Булгакоўскі, 1890).

У некаторых раёнах на Дабравешчанне «гукалі вясну». Дзяўчаты збіраліся ля гумнаў і лазняў, забіраліся нават на стрэхі і спявалі вяснянкі, што заканчваліся выклікам: «Гу!». Разводзілі невялікія кастры, вадзілі вакол іх «танкі». У Гомельскім павеце зафісавана бытаванне старадаўняй песні, у якой адлюстраваны звычай выкрадання і куплі нявест:

А ў нас сягодні Благавешчаньня! Гу!
Руднецкія дзевачкі, пярайдзіця к нам. Гу!
А ў нас хлопчыкі – дзяшовы тавар. Гу!
Па дзевяць на шэляг, дзесяты паддачы! Гу!
Рудненскія хлопчыкі, пярайдзіце к нам. Гу!
А ў нас дзевачкі дарагі тавар. Гу!

Па сто рублёў каса, па тысячы краса. Гу!..

*(Рудня – вуліца сяла Юркавічы Гомельскага павета; Раманаў, 1912)*

На паўднёвым усходзе Беларусі на веснавое свята прымяркоўвалі правядзенне старадаўняга абраду **«ваджэння і пахавання стралы»** з выхадам у азімае жыта.

Змест народнай традыцыі святкавання Благавешчання не выяўляе сэнсу царкоўнага свята Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы, якая ў той дзень пачула ад Анёла: «Не бойся, Марыя, бо атрымала мілату ад Бога. І вось ты зачнеш ва ўлоні і народзіш Сына, і дасі Яму імя: Ісус.» Свята ўпершыню пачалі адзначаць у IV стагоддзі нашай эры ў Канстанцінопалі.

У Югаславіі, Балгарыі гэты дзень па царкоўнаму календару ў католікаў, праваслаўных і славян-мусульман прысвечаны дзеве Марыі, а па народнаму календару – барацьбе са змеямі. Разнастайнасць адлюстравана і ў назвах: Благовести – у сербаў, чарнагорцаў; Благовец – у македонцаў; Blagovest, Blagovijest, Svetica, Sadovnica, Marcenica – у харватаў; Marijino oznanjenje – у славенцаў; Благовец, Благовещение, Благощене – у балгар. (КЗ, 1977. С. 254, 283). Румыны параўноваюць свята Blagovesfenie (Bunavesfire) з Пасхай і лічаць, што пачынаюць «развязвацца птушыныя языкі» (С. 302).

Слушнай падаецца думка У.Уласава (1993. С. 111) аб магчымым святе змяі (25 сак. па с. ст.) у славян, што выходзіць з палеаліту. Звычаі беларусаў на Звеставанне даюць нямала забаронаў адносна капання зямлі і ўспамінанняў пра змеяў (Васілевіч, 1998. С.412).Прычыны абагаўлення вужоў і гадзюк даследаваў А. Ненадавец (1996). Рускі даследчык В. Уласаў выказвае меркаванне, што з палеаліту бярэ пачатак свята свята Лады (першых родаў пасля купальскіх ініцыяцый), свята нябеснага агню, з мезаліту -- «свята Маці – сырой-зямлі (яе «род»). Заўважаецца таксама ў традыцыях 25 сакавіка народаў Еўропы даўнія сляды памінання продкаў (С. 114, 127).

**8/26. Благуста.** Наступны дзень за Благавешчаннем. На Кобрыншчыне гавораць: «На Благуста сій капусту» (Талстая, 1986).

***Засеўкі.** Звычайна пачыналі на Хрышчатым тыдні або пасля Благавешчання. Селянін адзяваўся ў чыстае, браў з сабой грамнічную свечку, «хрэсты», асвечаную галінку вярбы, яйкі... Абходзіў тры разы каня з сахою, даваў ахвяру зямлі, духу нівы (костачкі ад рытуальнай ежы, яйкі, «хрэсты»), ставіў галінку вярбы, свечку і араў. Сеялі ў суботу або нядзелю «у поўню», каб былі каласы поўнымі (Кобрынскі п.; Крачкоўскі, 1897).

У Румыніі звычай «парніря плугу лугі» (pornirea plugului) -- падрыхтоўка плуга да працы – праводзіўся на другі ці трэці дзень пасля Саракоў (КЗ, 1977. С. 301).

У Гомельскім павеце раілі: «Пшаніцу лепш сеяць у тры тэрміны: раннюю – да Юр'я, сярэднюю – калі ў жыта высыплецца колас і познюю – адначасова з грэчкай. Грэчку ж лепш сеяць за два тыдні да Купалы» (Раманаў, 1912).

У гонар таго, што асноўныя работы пачыналіся ў селяніна не ў хаце, а на двары і менш прыходзілася карыстацца асвятленнем, выконвалі абрад **«Жаніцьба Коміна»** («Ек засеўкі – будуць топіць, варыць, а до коміна вяжуць хмель да сухімі зернятамі посыпаюць» (Тураўскі сл., 1982).

**9/27. Матрона.**

Пакутніца Матрона Салунская (III-IVст.) вядома па прымаўцы у раёнах Заходняй Беларусі: «На Матрону шчупак хвастом лёд прабівае» (Паўлюкоўскі, 1934).

***Вербніца (Вербіца, Вербіч, Вярба, Вербная нядзеля)** – нядзеля перад Вялікаднем. Пачатак **Вербнага тыдня**. У царкве ў суботу асвячалі галінкі маладой вярбы, адзін аднаго сцябалі імі, прыгаворваючы: «Вярба б'е, не я б'ю, за тыдзень – Вялікдзень. Будзь здаровы, як вада, будзь багаты, як зямля!». У Вяліжскім павеце гаварылі: «Вярба хрёс! Сякі да слёз, ні я сяку – вярба б'ець; трэці раз на здароўя!» (Шлюбскі, 1927). Ва ўсходнеславянскіх народаў прыгаворы былі падобныя, з нязначным вар'іраваннем. У некаторых мясцінах пасля асвячэння галінак з'ядалі адну ці дзевяць пупышак вярбы (ягадныя зярняты ядлоўцу), «каб не балелі зубы і не было ліхаманкі» (Булгакоўскі, 1890). Галінкі тыя захоўвалі. Пашаптаўшы замову, вярбою гналі першы раз кароў на пашу. «Верба свята – нова лята, верба пасвіці ў поле гнала». На Тураўшчыне казалі: «Вербіч не пройшоў, то кожуха не кедай. Прыдзе Вербіч – кожуха торбіч» (Тураўскі сл., 1982). У Крупскім раёне гаворацьі: «Свята Вербніца сошкі правіць» (Грынблат, 1967).

Адзначэнне хрысціянскай Вербнай нядзелі мае з народнымі традыцыямі большыя сувязі, чым іншыя святы. Як народная, так і царкоўная традыцыя маюць адзін асноўны сімвал – вярбу.

Згодна біблейскай гісторыі, пасля таго як Ісус Хрыстос уваскрос з мёртвых у суботу Лазара, Выратавальнік у наступны дзень як Месія (абяцаны Старым Запаветам) уязджае на осліку ў Іерусалім. Напярэдадні іудзейскай Пасхі ў горадзе было шмат людзей, з усёй Палесціны, якія жадалі ўбачыць Памазаніка Божага, які здзіўляў сваёй мудрасцю, прароцтвамі і цудамі.

Па даўняй традыцыі радасны і ўсхваляваны народ расцілаў дарогу Ісусу маладымі пальмавымі галінкамі.

«Пераходнае» хрысціянскае свята Уваход Гасподні ў Іерусалім (за тыдзень да Вялікадня) лічыцца вялікім «двунадзесятым» святам (з ліку дванаццаці). На нашых землях, дзе не раслі пальмы, з'явіўся (ці існаваў?) падобны звычай, які звязаны з галінкамі вярбы, якая адна з першых распускаецца пасля зімовага сну. Вядомы выпадкі асвячэння ў царкве і галінак лазы ці ядлоўца. Лічылася, што ў гэты дзень з лазы выганяецца «нячыстя дух».

У Францыі маецца некалькі назваў Пальмавага тыдня (Dimanche des Rameaux): Квітнеючая Пасха, Пасха з самшытам, Нядзеля асанны, на якіх асвячаюцца галінкі самшыта, пальмы, размарына, лаўра. Афіцыйная назва ў Італіі -- «Пальмавая нядзеля», а ў народзе часцей называюць «Днём аліў», там таксама існуе звычай злёгку біць адзін аднаго рытуальнымі асвечанымі галінкамі.

Польскія даследчыкі знаходзяць у Вербнай нядзелі (Kwietnia, Biala, Palmowa niedzela), якая цесна звязана з царкоўным рытуалам, элементы язычніцкай магіі (урадлівасці, аберагу і інш.), бытавыя сцэнкі (КЗ, 1977. С. 208). Гэтая пара ў палякаў прадстаўлена багацей, чым ва ўсходніх славян. «W Niedziele, Kwietna dzien jasny – jest to dla lata znak krasny» (У Нядзелю квітную ясна – то знак для лета красны) (Ярмолаў, 1901. С. 109).

У Балгарыі Лазараўскія гульні дзяўчат завяршаліся ў Вербную нядзелю абрадам кумлення, які ў нас бывае пазней.

***Каталіцкая Пасха, Вялікдзень*** у католікаў. Бывае раней праваслаўнай. На Шумілiншчыне гавораць: на каталіцкую Пасху і ў суботу перад ёю нельга садзіць бульбу, бо завядуцца чэрві.

Як справядліва заўважыў фалькларыст А.Ліс (1998), «адметная з'ява ў валачобных песнях – момант пераадолення канфесійнага падзелу беларускага этнасу: у сюжэце «працоўны каляндар» у залежнасці ад асяроддзя бытавання аднолькава функцыянiруюць вобразы апосталаў-святаў праваслаўнага і каталіцкага сінкліту» (С. 54). Пагаджаючыся з гэтым, мы часцей робім апісанні праваслаўных і каталіцкіх святаў у агульных артыкулах.

*Пачатак **Белага (Страснага, Вялікага) тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі хаты. Існавала такая прыкмета: як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я (6 мая) на «голы» лес, то не чакай ураджаю; будзе хварэць жывёла (Раманаў, 1912; Цэбрыкаў, 1862). У веруючых асабліва строгі пост, які рыхтуе да сустрэчы Светлага Хрыстова Уваскрэсення. «Страсці» – гэта пакуты Ісуса, які перанёс распяцце на крыжы за грахі чалавечыя.

У Скандынавіі, як і ў іншых краінах, у абрадах таксама прысутнічала асвячоная вярба, якой выганялі, напрыклад, кароў. Дні ўсяго тыдня мелі свае назвы: Блакітны панядзелак, Белы аўторак,

Чорная (попельная) серада, Вялікі (Чысты) чацвер, Доўгая (Страсная) пятніца, Вясёлая субота, Чырвоная (Вялікая) нядзеля (КЗ, 1977. С. 115).

**14/1. Прабуджэнне дамавіка.**

Паўсюдна вядома выслоўе: «Апрэль – нікаму не вер», якое карэспандэнтамі этнографа Ю.Крачкоўскага (1874) тлумачылася тым, што нібы ў гэты дзень прабуджаўся дамавік і неабходна было хлусіць, каб заблытаць яго. У народным календары гэта рэдкі факт анімістычных вераванняў продкаў сляды якіх засталіся ў сучаснасці.

**Мар'я.** У памяці людзей прападобная Марыя Егіпецкая (пам. у 522 г.) звязана з разводдзямі, за якімі яна прыходзіла, пасля чаго з'яўлялася надзея на вялікую траву. Калі ў ясную ноч прыбывала вада, то лічылася, што суха будзе ў жніво на хлебнай ніве (Ляснічы, 1990).

*Чысты аўторак.** На Случчыне сцвярджалі: «У Чысты панядзелак і аўторак не можна ў хаце трымаць чаго-небудзь нечыстага, бо на людзей і на говядо нападуць паршы» (Сержпутоўскі, 1930).

**15/2. Палікарп.** Дзень хрысціянскага пакутніка Палікарпа (IV ст.) асацыіруецца з голадам, бо раней да гэтага часу адсяваліся, і часцей апошнім зернем. «На Палікарпа пачатак бясхлебіцы», -- гавораць у народзе (Паўлюкоўскі, 1934).

*Дравяная страсць** – серада на Страсным (Белым) тыдні. Мыюць у хаце ўсё драўлянае (Талстая, 1986). Пярэдадзень Чыстага чацвярга вызначаецца наступным звычаем: «кладуць пад страху хлеб, соль і мыла. З гэтым хлебам (на Юр'я) выганяюць скаціну, соль дапамагае ад сурокаў, а мылам у чацвер да сонца мыюцца ў лазні, каб быць чыстымі цэлы год» (Раманаў, 1912).

**16/3. Мікіта.** На Мсціслаўшчыне гавораць: «На Мікіту няма ні зімы, ні лета». У ішных раёнах вядома: «Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбаловам» (Ляснічы, 1990). У царкоўным календары – дзень прападобнага Мікіты, спавядальніка (824 г.).

*Чысты (Дравесны, Жыльны, Вялікі) чацвер (Жыльнік)** – чацвер на Вербным тыдні. Хадзілі мыцца ў лазню, на «бягучую ваду», на расу, каб не было на целе хвароб, клапоў у хаце: «Чысты чацвер вулкі чысце, дваркі мяце, слядкі кладзе... к святому Вялічку». У хаце ўжо ўсё было памыта, бо, як лічаць на Свіслаччыне, у гэты дзень нельга мыць – «зальеш Хрысту вочы». Варылі вячэру (нават з дванаццаці страў), у некаторых раёнах не елі – «жыльнікавалі» да Вялікадня. У Смаленскай губерні заклікалі на вячэру «мароза»:

Мароз, мароз,
Ідзі кісель ісць!
Ня бей наш авёс.

Вясна-красна
Каля рэчышкі ішла,
К нам прышла,
Лета прынісла.
*(Дабравольскі, 1914)*

Там жа, сядаючы на палок у лазні, гаварылі: «Хрышчыны на палок, нехрышчыны – з палка», выходзячы, пакідалі лазніку вядро вады і венік.

Дзень звязаны з мыццём. Нельга было толькі чысціць коміны, бо «Пану Езусу ў вочкі сажы натрусіць» (Федароўскі, 1897). Трэба абмятаць сваё семішча, «каб гадаўя не было» (Хойніцкі р.; Талсты, 1978), вымятаюць падлогу голым, «каб у хаце не было блох» (Раманаў, 1912). Звычай з вадою, мыццём – галоўныя ў свяце не толькі ў беларусаў.

Аралі і сеялі. «Чысты чацвер ячмень засяваець»; «Вялікі чвартак – гаспадар ідзець у поле з сівым канёчкам ды із плужочкам, пачынаець поле араць яравое». У гэты дзень садзілі капусту, каб расла чыстай. Прыкмячалі: як на Чысты чацвер добрае надвор'е, то і на Ушэсце, і на Вялікдзень будзе такое ж.

У Лельчыцкім раёне праводзілі абрад **«мыцця хлебнай дзежкі»,** яе мыццё зафіксавана і ў іншых раёнах Беларусі (Васілевіч, 1998). Каля хаты рабілі «аганец» (касцёр) са смецця, падмеценага ў хаце і вакол яе. Дзежку ля «аганьца» мылі. Затым аблівалі выкарыстанай вадою хату. Раніцай пралі леваю рукой «чацвярговыя ніткі». Потым сатканым з іх палатном перавязвалі раны, розныя хваробы на целе. Наглядалі за надвор'ем: дождж у той дзень абяцаў малако ў кароў (Шэйн, 1902). Каб было добрае малако, бралі ваду перад усходам сонца ў месцах зліцця двух ручаёў і мылі вымя і саскі; а каб была густой смятана – з трох чужых палёў прыносілі па тры камені і парылі імі малочны посуд (Віцебскі павет; Іваноў, 1910).

Песень не спявалі, бо працягваўся Пост. Але ў Лельчыцкім раёне намі зафіксавана балада рэлігійнага зместу, што выконвалася ў гэты дзень. Зачын яе распавядае аб граху жанчыны:

У Чысты чэцьвер повечэраў,
Пойшоў Хрыстос по беседах.
Ішоў Хрыстос дорогою,
Сустрэў дзеўку з водою.
-- Дай мне, дзеўка, воду піці;
Смаглы вусны промочыці.
-- Не дам, пане, воды піці;
Бо моя вода не чыстая.
Із горы песку пасыпано,

Кленового ліста налістано.
Сама, дзеўка, не чыстая,
Усю воду знечысціла.
Дзеўець сыноў породзіла,
Да й ніводного не хрысціла...

Заканчваецца балада пакараннем грэшнай, якое выконваюць яе сыны.

Звяртае на сябе ўвагу адноснае багацце язычніцкай традыцыі ў дзень Чыстага чацвярга, які звязаны з рухомым царкоўным календаром. Міжволі ўзнікае думка аб існаванні ў дахрысціянскі перыяд нейкага невядомага нам язычніцкага святкавання, якое ў народнай традыцыі злілося з царкоўным.

Д.Зяленін выказаў думку, што гэты дзень быў раней звязаны з Новым годам, які пачынаўся ў сакавіку (1916. С. 391).

Вялікі чацвер – гэта ўспамін аб Тайнай Вячэры, калі праследуемы Хрыстос апошні раз вольна сустракаецца са сваімі дванаццаццю вучнямі перад здрадай аднаго з іх – Іуды. Іуда Іскарыёт пасля вячэры ў садзе здрадніцкім пацалункам указаў на Ісуса, якога тут жа схапілі стражнікі. Царква ў сваіх песнапеннях і іншых дзеях смуткуе і спачувае Вялікаму Пакутніку і Выратавальніку.

***Чырвоная (Вялікая, Велікодная, Пакутная) пятніца**. Рыхтаваліся да вялікага свята. «Пасцілі шчодрым постам, толькі сыту з мёду пілі» (Лельчыцкі раён). На Смаленшчыне і ў іншых раёнах Беларусі сеялі гарох, каб добра ўрадзіў (Дабравольскі, 1914), а пасевы збожжа «не баяцца ні ветру, ні дажджу, ні граду» (Нікіфароўскі, 1897).

Згодна Бібліі, гэта дзень калі быў раскрыжаваны на Галгофе Ісус.

***Чырвоная (Велікодная, Вялікая) субота (Таўкушчы дзень)**– апошні дзень перад Вялікаднем. Пяклі пірагі, фарбавалі яйкі цыбульнікам ці васковымі жамерынамі (васкавадам). На Мазыршчыне фарбавалі ў чырвоны колер, але калі хто-небудзь з родных паміраў у годзе, дык – у чорны ці які іншы. Хадзілі на могілкі прыбіраць.

«У Вялікую суботу ўночы дванаццаць сялянскіх дзяўчат надзяваюць белыя кашулі, бяруць саху і праводзяць ёю баразну вакол усяго сяла з малітваю: «Да ўваскрэсне Бог». Гэтым, паводле павер'я сялян, адыдзе ўсё нядобрае на цэлы год» (Шэйн, 1902). Палілі кастры. Усю ноч у хатах гарэла святло. Чырвоная субота – напамінак аб знаходжанні Выратавальніка з целам ў дамавіне і Яго адыходжанні душою ў пекла.

***Вялікдзень (Вялігдзень, Вялікадзень, Вялічка, Пасха, Паска, Хрыстос)** – вялікае гадавое веснавае свята, карані якога вядуць у глыбокую старажытнасць. Ім некалі адкрываўся новы каляндарны год. Пазней царква замацавала яго ў сваім «рухомым» пасхальным календары. Свята пачыналася «ўсяночнай». З Краснай суботы на нядзелю многія не спалі, на вуліцах гарэлі кастры, чулася стральба, некаторыя шукалі папараць-кветку, у царкве свяцілі пафарбаваныя яйкі, пірагі, мак, хрэн, мяса і інш. Раніцай хадзілі глядзець «гульню» сонца, пафарбаванымі яйкамі гулялі «ў біткі», качалі іх, гушкаліся на арэлях, вадзілі карагоды.

Умываліся вадой з чырвоным яйкам. Елі толькі свянцонае. Лічылася, што смерць у святы дзень, нават для цяжкага грэшніка, святая; атрымліваюць дараванне грахоў. «Ад Вялікадня да Узнясення Ісус Хрыстос ходзіць па зямлі ў вобразе жабрака, і таму ў гэты час трэба абавязкова даваць міластыню» (Дабравольскі, 1914).

Каляндарныя валачобныя песні -- характэрная адметнасць беларусаў. Нічога падобнага ў славянскім фальклоры няма. У адной з песень што выконваліся на Вялікдзень, гаварылася:

Старым і малым яечкі качаць
Яечкі качаць, святцаў праважаць.
А гэта святца адзін разочак у гадочак...

А таксама:

Святое Вялічка ды гуляць вяліць
Малым дзеткам з красным яечкам,
Старым мужам – мужжываннейка,
Старым бабкам – пагуканнейка,
Маладым малайцам – паляваннейка,
Маладым паненкам – пагуляннейка...

Лічылася, што на Вялікдзень пачынае кукаваць зязюля.

На Случчыне дзяўчаты скакалі цераз сані. «Каторая, пераскакваючы, упадзе, тая застанецца старою дзеўкаю дзеваваць» (Сержпутоўскі, 1930). У некаторых раёнах Гомельскай вобласці «вадзілі стралу».

У народных вышыўках Вясна-Вяснянка звычайна адлюстроўваецца ў выглядзе дзяўчыны з вянком на галаве, кветкамі ў руках (Кацар, 1996. С. 83-86).

Адным з яркіх сімвалаў Вялікадня стала яйцо, традыцыя фарбавання якога пачалася амаль адразу пасля Уваскрэсення Хрыстова. Марыя Магдаліна, сведка вялікай падзеі сустрэчы ў Светлую Нядзелю Ісуса на трэці дзень пасля крыжавання, прыбегла да імператара Тыберыя ў Рым з чырвоным яйцом і словамі: «Хрыстос уваскрос!». Чырвоны колер – знак Божых пакут дзеля людзей.

Але яйцо на хрысціянскую Пасху з'явілася не на пустым месцы і не выпадкова, бо існавала яшчэ глыбейшая язычніцкая традыцыя. У старажытных міфах народаў свету птушынае веснавае яйцо ўяўлялася як мікракосм, у якім адлюстроўваўся Сусвет. Падобнае фарбаванне сустракалася яшчэ ў старажытным Кітаі і Егіпце, адкуль, як лічаць вучоныя, традыцыя распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе.

Традыцыя Пасхі таксама мае больш глыбокія карані. Яна ўсталявалася яшчэ раней самага вялікага хрысціянскага свята. Афіцыйна адзначэнне царкоўнага святкавання пачалося з 525 года, калі на Першым Усяленскім царкоўным саборы ў Нікеі было вырашана ўстанавіць Пасху ў першую нядзелю пасля вясенняга раўнадзенства (22 сакавіка) і поўні пры ўмове, што яна ніколі ўжо не будзе супадаць з іудзейскай як было дагэтуль.

Слова «пасха» ў перакладзе са старажытнаяўрэйскай мовы («песах») азначае «прахаджэнне побач», «літасць». Паходжанне значэння слова тлумачаць наступным чынам. У некаторых краінах Бліжняга Усходу дахрысціянскага перыяду існаваў культ багоў, адны з якіх паміралі, а іншыя з прыходам вясны адраджаліся. Да гэтага часу неабходна было заплаціць падаткі, ахвяраваць багам жывёліну і пазначыць уваход у жылле яе крывёю. Збіральнікі падаткаў такія хаты пакідалі ў літасці, праходзілі побач. Пазней да ахвяравальных знакаў, пасхальнай (велікоднай) сімволікі далучылася і фарбавальнае яйцо.

У многіх краінах яйцо таксама займае адно з важнейшых месцаў у народных рытуалах. Так, у Францыі – гэта і падарунак, і аб'ект рытуальнай стравы, і сродак гульні. Як і у нас, там гулялі ў біткі, каталі з нахіленай плоскасці і нават кідаліся адзін у аднаго крутымі яйкамі. У Англіі Пасху называюць Easter, што паходзіць ад імені багіні ранішняй зоркі і вясны Eostre, якая шануецца англасаксамі (1977. С.42,96). У немцаў – Ostern, Parken (на ніжненямецкім дыялекце), у чэхаў і славакаў –Velikonoce, у палякаў – Wielkanoc.

Французскія і нямецкія прымаўкі гавораць: калі Пасхальны тыдзень дажджлівы, то лета будзе сухое, Французы ў такім выпадку чакаюць добрага ўраджаю хлеба, а немцы – наадварот (Ярмолаў, 1901. С. 197).

Даследаванні веснавой традыцыі Беларусі, як і краін замежнай Еўропы, паказваюць, што Вялікдзень мае яшчэ дахрысціянскую аснову, як земляробчае свята, у якім адно памірае, а другое нараджаецца. Нават у гульнях з катаннем яец даследчыкі знаходзяць магічныя рысы. Яйцо, якое сімвалізуе нараджэнне новага жыцця,

сутыкаючыся з зямлёю, павінна было прабудзіць яе ад зімовага сну, апладніць (Сакалова, 1979. С. 113).

***Працяг Велікоднага тыдня**. У царкоўным календары – гэта Светлая седміца. У панядзелак і аўторак свята працягваецца. У большасці раёнаў Беларусі хадзілі валачобнікі. Спявалі песні гаспадару і гаспадыні, дзяўчыне, хлопцу, бабцы. У адной з іх апавядаецца:

Першы дзень пірагі маюць, *(нядзеля)*
А сярэдні дзень пагуляюць*, (панядзелак)*
А паследні дзень выпраўляюць. *(аўторак)*

У асобных валачобных песнях у паэтычнай форме паказваецца ўвесь земляробчы каляндар селяніна, які пачынаецца Вялікаднем, які і неабходна лічыць пачаткам году, Новым годам:

...Першага свята – святога Вялікдзень,
Свят Вялікдзень з красным яечкам,
Другога свята – свята Юр'я,
Трэцяга свята – свята Міколу...

З Новым годам і калядаваннем звязваецца валачобніцтва і праз лялькавую скрыню «Ягорый», што насілі некаторыя гурты. Адметны беларускі звычай узнік пад уздзеяннем батлейкі.

У першы і другі дзень моладзь на ўсходнеславянскіх землях аблівалася вадою. У 1721 г. Петр I сваім указам забараніў гэты звычай у Расіі.

Рускі даследчык У.Проп заўважаў, што «у беларусаў калядаванне з Раства было перанесена на Пасху. Гэта перасунуты абрад, другое мясцовае беларускае ўтварэнне (1963. С. 53). Але лепш было сказаць не «перанесена» і «перасунута», а ва ўсякім выпадку створана па аналогіі (калядаванне засталося на месцы). Не выключаецца і тое, што валачобна-вясеннія віншавальныя абрады маглі існаваць (што верагодней) яшчэ ў дахрысціянскі перыяд. Справядліва зазначыла Л.Салавей, што неабходна разглядаць «валачобныя песні як навагоднія велічальна-віншавальныя, ідэнтычныя з калряднымі (шчадроўкамі) па накіраванасці і функцыі» (Валачобныя п. С. 7). Таксама можна пагадзіцца з думкай Я.Карскага аб тым, што «Гэта выключная прыналежнасць беларусаў... Валачобных песень няма нават у маларосаў: з іншых славян маецца падобнае ў сербаў» (1916. С. 147). Другая частка выказвання, на наш погляд, патрабуе дапаўнення.

У некаторых краінах замежнай Еўропы таксама выконваліся песні віншавальнага рэлігійнага зместу. У Францыі ў Пасхальную нядзелю дзеці і моладзь звычайна абходзілі вёску з песнямі, падобнымі на калядныя, і збіралі яйца, каўбасу, сала (КЗ, 1977. С. 42). Падобнасць з нашымі песнямі наглядаецца ў народаў

Пірэнейскага паўвострава. У Каталоніі дзеці спявалі «радасці» (goigs), якія заканчваюцца словамі: «Пакладзіце яец у карзіну, бо «сем радасцяў» закончаны, і кавалак сала, і свіннай каўбасы багата», калі ж гаспадары не задавальняюць падарункамі, то ім могуць праспяваць: «Гэтаму блаславеннаму дому не жадаю зла; тры дні хварэць жыватом і пяць дзён зубамі» (С. 64).

У Польшчы быў звычай у Велікодную нядзелю і панядзелак «хадзіць па валачэбным». Ва ўсходніх раёнах, як і ў суседніх беларускіх, валачобнікі насілі на жэрдцы ляльку і спявалі дзяўчыне «Cienka, mala konopielka...», а нежанатаму хлопцу «Bujny owies». У Варміі і на Мазурах хадзілі «выкупнікі» (wykupnik) з галінкай вярбы ці ядлоўца спявалі песні з пажаданнямі (С. 211-212). У Лазаравую суботу і Вербную нядзелю ў Сербіі і Македоніі хадзілі «лазарыцы» – групы дзяўчат – як і калряднікі, сярод якіх быў «лазар» і «лазарніца», што выконвалі рытуальны танец з шаблямі (С. 255). «Лазараванне» вядома і ў Балгарыі, дзе гэты «калядны» звычай выконвалі ў хатах і полі дзяўчаты «лазаравы булкі» у абрадавым «вясельным» убранні. Лазаравы гульні, акрамя агульнай трапезы, уключалі і звычай кумавання (кумичене) (С. 284-285). Падобнае з валачобным абрадам можна знайсці і ў іншх народаў у розныя каляндарныя перыяды. Так, дзяўчынкі-чэхі на Каралеўскую нядзелю (пасля дня Святога Духа перад Тройцай), прыбраныя каралеўнамі (kralovnicky), хадзілі з дрэўцам «маем» і спявалі карагодныя песні, як і пры пасхальным абрадзе пасля «вынасу марэны» (С. 234).

21/8. **Руф (Рухлы)** – прысвятак, у беларусаў Смаленшчыны лічыўся апошнім днём зімы. Руф рушыць снягі, зіму. «Пуд снег пудзіць, а Рухлы атусюль парушыць – і з гор, і з лясоў, і з раўкоў» (Дабравольскі, 1894). Назва прысвятка паходзіць ад прападобнага Руфа, пустэльніка Пячэрскага (XIV ст.).

**Радзівонаў дзень** – пачатак палявых работ на поўначы Беларусі (Ляснічы, 1990). У праваслаўным месяцаслове – апостал Ірадзіён, родзіч апостала Паўла (I ст.).

Пачатак ***Праводнага (Вархушына, Мёртвага) тыдня (Провады, Градавая серада).** Серада пасля Вялікадня. У Драгічынскім раёне пасля работы вечарам зіму «ганілі»; На Піншчыне кідалі шкарлупінне з яек на ваду і спявалі: «Ідзі, зіма, бо ты нам хліб выела»; кідалі чырвоныя яйкі або камяні на поўнач, на вароты са словамі: «Пошла, зіма, до Кіева, а нам лето покінула» (Талстая, 1986).

Лічылася, што ў Градавую сераду, каб град не пабіў палі, трэба было абыходзіць іх з грамнічнаю свечкаю і пасціцца (Нікіфароўскі, 1897).

***Юры (Ежы)***: «Як настане юр'ева раса – не патрэбна коням аўса» (Сахараў, 1937).

Ва Усходняй Еўропе да святога Юрыя (Георгія) прымяркоўваліся святкаванні пастухоў. У Англіі, напрыклад, яны былі звязаны не з жывёлагадоўляй, а з Георгіем Воінам. У сярэднія вякі святы быў нават сімвалам Англіі. У 1222 г. Оксфардскай радай свята было аб'яўлена грамадскім і праіснавала да XIX ст. Найбольш ранні дакумент у Італіі, дзе сан-Джоржо названы днём Воіна, адносіцца да 1276 г. Ад пастухоўскага святкавання цяпер засталося мала слядоў.

У фінаў, як і ў беларусаў, Юрый (Yrjo, Jurki) лічыцца апекуном жывёлы і ваўкоў. Нават існаваў абрад «загаворвання пасці воўка». У Аўстрыі існавала гульня ў «Зялёнага Георга», якога вадзілі па хатах і заканчвалі яго смерцю і пахаваннем (КЗ, 1977. С. 25-26, 130, 171).

Нямала падобнага ў звычаях і нават прымаўках палякаў на дзень Ежы, апекуна аратаяў і пастухоў. «Do Swietego Jerzego powinno stac paszy u kazdego» – Да святога Ежэга павінна хапіць корму ў кожнага (Ярмолаў, 1901. С. 225).

Багата развітыя традыцыі святкавання Юр'евага дня наглядаюцца ў народаў Югаславіі. У назвах яго праяўляецца як язычніцкая, так і хрысціянская аснова Сточна слава, Сточни Велигдан – у сербаў, чарнагорцаў; Гургов ден, Гергев ден – у македонцаў; sv. Jurja, Jurjevo, Pastirski svetac – у славенцаў. У югаслаўскіх даследчыкаў няма адзінства і ў поглядзе на паходжанні старадаўніх абрадаў. Паралелі праводзяцца з рымскімі Паліліямі, культамі язычніцкіх багоў Лады, Ярылы, а таксама – дэмана ці боства лесу. Прызнаецца, што многія язычніцкія абрады ўвайшлі ў рытуал хрысціянскага свята (КЗ, 1977. С. 261-262).

Албанцы, сярод якіх 70% мусульман, пачынаюць новы год не 1 студзеня , а з дня Георгія (Shen – Gjergii abo Shngjergii).

У народаў Югаславіі існавалі абрады выклікання дажджу, якія праводзілі ў час засухі ад Юр'ева да Пятрова дня. Так званы дадольскі абрад, што вядомы іншым народам Еўропы, уключаў наступныя элементы: шэсце з упрыгожанай зелянінаю голай дзяўчынай «дадолы» («перперуны» і інш.), абліванне ўсіх удзельнікаў вадою, выкананне песень-заклічак аб дажджы ў суправаджэнні танца дадолы і калектыўная трапеза. Югаслаўскія даследчыкі звязваюць даўні звычай з культам Перуна (КЗ, 1978. С. 201).

У Югаславіі ў час падзежа жывёл былі вядомы звычаі «выловска богомолля», у якіх галоўную ролю выконваў элемент здабывання жывога агню (жива ватра) (КЗ, 1978. С. 206).

Да свята жывёл добра прымыкае вясенняя гульня ў Тура, якая запісана ў трох варыянтах у вёсках Бельскага павета (канец XIX ст.). Карагодная гульня адлюстроўвае наяўнасць загадкавай істоты, у якой было шмат жонак, якіх неабходна лавіць. Выкраданне жонак – гэта рудымент далёкай даўніны. Па сведчанні міфолага А.Афанасьева (1869. С. 660-695), Турыцы былі шырока вядомы славянам: у Галіцыі іх святкавалі ў пачатку траўня ці на Зялёным тыдні, у чэхаў першае траўня вядома як Кароўе свята, паўднёвыя славяне адзначалі Турыцы на Масленіцу, заходнія – каля Тройцы. Б.Рыбакоў у гульнях і танцах пра быка, у радзіміцкіх падвесках з галавой быка і сям'ю дзявочымі фігуркамі, знаходзіць адлюстраванне старажытнага славянскага абраду «турыцы», якія падобны да грэчаскіх таўракатапсій (1988. С. 665-666). Этнограф М.Сумцоў (1887) разглядае Тура як паэтычнага і рытуальнага персанажа, а А.Афанасьеў, П.Галубоўскі, А.Фамінцын слушна даводзяць, што загадкавая істота можа быць мясцовым язычніцкім боствам, якое ўпадаблялася Перуну, Ярыле. (Больш падрабязна гл.: Лозка, 1996. С. 38-40; 1997. С. 142-146). Акрамя таго, А.Фамінцын у грунтоўным даследаванні сцвярджае, што Тур з'яўляецца блізкім Ярыле боствам, якіх раздзяляюць «розныя найменні або эпітэты аднаго, менавіта сонечнага бога,... падобнага па характару свайму са старажытнагрэчаскім Дыянісам, роднасным яму Прыапам, са старажытнаіталійскімі Марсам і Ліберам» (1884. С. 261-262).

Даследчыкі (Уласаў, 1993) выказваюць думку, што дні 22-24 красавіка (па с.ст.) маглі быць святам, якое ўключала абрады многіх культаў. У ім злучыліся культы змяі і матрыярхальны (свята Рожаніц, што ідзе з верхняга палеаліту). У палеаліце зарадзілася і асноўнае свята агню, хатняга, «круглага». Наступнае развіццё традыцыі прыводзць да спалучэння змяі і Вялеса ( у «асноўным міфе» апошні мае выгляд змяі); ганаравання гэтага апекуна звяроў і жывёл (воўчае свята ў мезаліце). Ён пазней быў заменены на Юр'я-Георгія. У гэты каляндарны комплекс у неаліце дадаецца галоўнае славянскае земляробчае свята «залатога плуга, ярма і сякеры», дзень грамавержца, які звязаны з Вялесам (богам жывёл).

(Гл. таксама 6 траўня.)

***Войцах (Войцех).*** Па сведчанню польскага этнографа і збіральніка беларускага фальклору, сяляне ў гэты дзень прыносілі на поле пірог і качалі яго са словамі: «Божа, дай такі каласочак, як той піражочак» (Федароўскі, 1968). Таксама вядома прыказка, што зафіксаваў С.Сахараў сярод беларусаў Латвіі: «Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху» (Сахараў, 1940).

Палякі ў гэты дзень упершыню выганяюць на пашу жывёлу, аглядаюць палі і заўважаюць, што «тая пшаніца звычайна бывае

ўраджайнай, якая да свята Войцеха перапёлку перарастае» (КЗ, 1977. С. 214); гавораць: «Na Swietego Wojciecha pierwsza wiosny pociecha» -- На святога Вайцеха першая вясны пацеха (Ярмолаў, 1901. С. 222). Гэты сьвяты даволі папулярны ў прымаўках Польшчы.

***Людавы дзень*** – чацвёрты дзень сьвяткавання Вялікадня. Білі і качалі яйца з лубкоў. Гушкаліся на арэлях (Віленская губерня; Кіркор, 1882).

***Вялікадне мёртвых (Наўскі Вялікдзень, Шопшы Вялікдзень, Бабскі Вялікдзень, Мёртвы Вялікдзень, Наўская Пасха, Наўскі чацвер)**. Чацвер на Велікодным тыдні, дзень памінання на могілках памерлых. Парадкавалі магілы, вешалі новую хусцінку ці стужку на крыж. Рассцілалі на магілах ручнікі, палатно і выстаўлялі яду. Пасля памінання пакідалі чырвонае яечка, хлеб і інш. У Кобрынскім раёне расказваюць: «У нас колыся купалы (аблівалі вадою. – *А.Л.*) на Вэлыкдэнь дэвок, а у чатвэр – дэўкі хлопцэў» (Талстая, 1986).

**24/11. Анціп** – ахоўнік зубоў. Святкаваўся толькі тымі, у каго часта баляць зубы, і знахарамі, якія шэпчуць ад зубнога болю (Раманаў, 1912). У царкоўным календары – свяшчэнапакутнік Анціпы, япіскап Пергама Асійскага ( каля 68 г.).

***Прашчэнне (Прошчаны дзень).** Пятніца на Велікодным (Праводным) тыдні. У гэты дзень цесць і цёшча звалі зяця і яго радню на «маладое піва». Не працавалі, каб слюна не цякла ў валоў (Віленская губ.; Ярмолаў, 1901. С. 198).

**25/12. *Марк*.** «Дождж на Марка, дык зямля, як скварка» (БСК, 1937). У Свіслацкім раёне, дзе многія ведаюць польскую мову, згадваючы Вялікдзень, кажуць: «Ек бэндзе Велькавец на свянтэго Марка, то на земі не бэндзе ні еднэго недовярка» (не зусім веруючага).

У французаў, італьянцаў, палякаў існуе нямала прымавак і прыкмет пра апекуна зямлі. (Чытайце таксама : 8 траўня). Італьянцы выганяюць кароў на пашу: «A San Marko le vache passano il varco» – На святога Марка карова за агарожу. Французы заўважаюць: калі на Марка ў пшаніцы схаваецца варона і да 1 траўня воўк, то амбары ад хлеба будуць ламацца (Ярмолаў, 1901. С. 234-235).

Фіны на дзень святога Марка, які лічылі трэцяй летняй ноччу, вызначалі ўраджай зерневых і на драўляных народных календарах азначалі «плугам» (КЗ, 1977. С. 130); венгры, як і дзень Георга (Дьёрдь), лічылі святам пастухоў (С. 197), румыны (Marcu biolor) прысвячалі рагатай жывёле, перш за ўсё валам (С. 311).

**26/13.** Серада, пятніца паміж праваслаўным і каталіцкім Юр'ем. На Віцебшчыне лічылі: калі ў гэты перыяд народзіцца жарабя, то яго з'есць воўк (Нікіфароўскі, 1897).

***Праводная (Прабудная) нядзеля (Провады).** Нядзеля пасля Велікоднага тыдня, на якой праводзілі Вялікдзень і зіму ў некаторых раёнах Палесся. На Піншчыне гаварылі: «А ну, зіма, до Бучына, ужэ ты нам надокучыла. А ну, зіма, до Пэтрава, ты нам допэкла». Кідалі пасталы ў агонь і скакалі праз яго. На Століншчыне вечарам або на наступны дзень качалі яйцо качаргою, прыказваючы: «Ідзі, зіма, до Кучэва, ужэ ты нам надокучыла. Ідзі, зіма, до Кракова, прыйдзеш до нас одзінакова» (Талстая, 1986). У Лельчыцкім раёне «рэзалі хвасты» каровам, замыкалі адрыну, каб «змей не зайшоў». Хадзілі на могілкі памінаць родзічаў. У Ельскім раёне лічаць нядзелю Радаўніцай, а аўторак – Провадамі Радаўніцы. Провады Вялікадня могуць быць і ў панядзелак.

У Польшчы таксама першая нядзеля ад Вялікадня мела назву «Niedziela przewodnia», на якую дзеці і моладзь атрымлівалі «пісанкі», качаліся на арэлях, абліваліся вадою (КЗ, 1977. С. 214).

***Радаўнічныя (Радунічныя, Радасныя) Дзяды.** Звычайна адзначаліся ў панядзелак перад Радаўніцай. Называліся яшчэ Жывой радаўніцай у адрозненне ад Мёртвай у аўторак (Крачкоўскі, 1873; Пшчолка, 1912).

**28/15. Пуд.** На Смаленшчыне зазначалі: Руф рушыць, а Пуд так «пугне» снег, што яго не застанецца ў равах (Цэбрыкаў, 1862). «Пуд снег пугне» (Ярмолаў, 1901. С. 218). Царкоўны каляндар фіксуе – апосталаў ад 70-ці: Арыстарха, Пуда і Трафіма (каля 67 г.). Гэтых апосталаў з ліку 70-ці Ісус Хрыстос паслаў перад сабою для прапаведвання з Евангельскім Звеставаннем.

***Радаўніца (Радуніца, Провады, Праводная ці Мёртвая Радаўніца, Мёртвы дзень, Праводны дзень)** – аўторак другога (Фамінога) тыдня пасля Вялікадня, дзень памінання памерлых на могілках. Вядомы ва ўсіх славян. У народзе гавораць: «На Радаўніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць». У валачобных песнях пяецца:

Радаўніца –
Сталы засцілаць,
Дзядоў памінаць...

Радаўніца
Бараніць
Чыста поле
Яравое
Да й раўнуіць...

Каб зберагалася збожжа ў гумне, у Свіслацкім раёне цераз яго кідалі тры разы яйка, якое пры тым не разбівалася.

Рускія на Радуніцу спраўлялі «вьюнец», за якім спявалі абрадавыя песні ў гонар маладых, якія абвянчаліся на Краснай горцы (Праводны тыдзень).

Падобны абрад і ў тую ж пару, як і ва ўсходніх славян, вядомы ў лемкаў і ў народнасцяў Сербіі, які называецца Задушніца (Анічкаў, 1903. С. 297). Старажытнасць абрада даследчыкі (Сакалова, 1979. С. 122 і інш.) бачаць у тым, што пасля памінання і галашэнняў пачыналася шумнае святкаванне з песнямі, скокамі, асабліва гэта захавалася ў Беларусі і Сібіры. У рытуальным вяселлі і песнях праяўляецца імкненне пераадолення смерці, паралізуючае ўздзеянне на яе, сцвярджальнасць жыцця. Аб язычніцкім характары старажытнай трызны гаварыў у сваім «Слове» Хрысталюбец: «беззаконьная трапеза, менимая Роду и Рожаницам» (гл.: Анічкаў, 1914. С. 378).

29/16. **Арына (Ірына).** Прысвятак, які атрымаў жаночае імя, ад пакутніцы Ірыны (пам. у 304 г.), арыентаваў сялян у тэрмінах пасадкі на агародзе. «На Арыну сей капусту на расаду» (БСК, 1937).

30/17. **Зосім (Засіма).** Згодна народным паданням, гэта ахоўнік пчол (Цэбрыкаў, 1862; Дабравольскі, 1891; Раманаў, 1912). Ён упамінаецца ў многіх пчаліных замовах. Прападобныя Зосім і Савацій (XV ст.) з'яўляюцца заснавальнікамі манашаства на Салавецкіх астравах. У Расіі іх называюць «пчалаводамі» («пчельниками»). Зосіма яшчэ лічаць распаўсюджвальнікам пчалаводства на поўначы. У адным з рукапісных малебнікаў распавядаецца як салавецкія ўгоднікі пасля далёкіх падарожжаў па волі Бога прывезлі ў булавешцы посаха матку пчалы для развядзення на рускай зямлі.

**Андрыянава ноч (Андрэй).** Вядома ў некаторых раёнах Палесся як ноч дзявочых гаданняў і варажбы пра замужжа. Гадалі на канапляным семені, якое пабывала ў царкве. Прасілі ў Андрыяна, або Андрэя, каб прысніўся той, з кім дзяўчына будзе «у пары на вясне». «Святы Андрэю, канапелькі сею» (Слуцкі п.; Сержпутоўскі, 1930). Пакутнік Андрыян памёр у 251 годзе.